# ВОДЗЫЎ

на дысертацыю Талмачовай Святланы Аляксандраўны
“МЯСЦОВЫЯ ОРГАНЫ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ АГРАРНАЙ ПАЛІТЫКІ РАСІЙСКАГА ЎРАДА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1861–1914 гг.)”,
прадстаўленай на саісканне вучонай ступені
доктара гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

**Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны.**

Змест дысертацыйнага даследавання Талмачовай С. А. “Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі (1861–1914 гг.)” адпавядае спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя і галіне навукі – гістарычныя, а таксама сферы даследавання – сацыяльна-эканамічнае развіццё грамадства на тэрыторьі Беларусі ў адпаведнасці з пашпартам спецыяльнасці, зацверджанага 01.06.2022 загадам № 180 Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь.

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.**

Праблемы аграрнай гісторьі былі і застаюцца актуальнай тэмай даследавання гісторыкаў як у прошлым, так і ў цяперашні час. Складаным і адначасова ўнікальным і супярэчлівым аб’ектам вывучэння сталі аграрныя пераўтварэнні ў Расійскай імперыі і, у прыватнасці, у беларускіх губернях пасля рэформы 1861 года. Аналізу аграрнай палітыкі была прысвечана вялікая колькасць работ як дарэвалюцыйных, так і савецкіх гісторыкаў. Не застаюцца па-за ўвагай гэтыя праблемы і ў цяперашні час. Сучасная расійская і айчынная гістарыяграфіі пашыраюць праблематыку па вывучэнні аграрных пераўтварэнняў другой паловы XIX – пачатку XX ст. Вызначаюцца новыя падыходы ў асэнсаванні мадэрнізацьі гаспадарчых адносін у аграрным сектары, які займаў істотнае месца ў структуры эканомікі Расійскай імперьі і выклікаў гарачыя дыскусіі не толькі эканамічнага, але і палітычнага характару. Аднак пры наяўнасці вялікай колькасці работ па гэтай тэматыцы далёка не ўсе праблемы былі грунтоўна і аб’ектыўна даследаваны. У прыватнасці, практычна “белай плямай” доўгі час заставаўся механізм рэалізацьі рэформы і дзейнасць мясцовых дзяржаўных структур па яе правядзенні. Таму дысертацыйнае даследаванне С.А.Талмачовай, прысвечанае мясцовым органам дзяржаўнага кіравання, створаным для рэалізацьі аграрнай палітыкі расійскага ўрада і іх дзейнасці на тэрыторыі Беларусі ў 1861–1914 гг., з’яўляецца актуальным і своечасовым. І хаця асобныя сюжэты разглядаліся папярэднімі аўтарамі, аднак комплекснага, сістэматызаванага, аб’ектыўнага навуковага даследавання, прысвечанага раскрыццю іх шматграннай дзейнасці ў дынаміцы на працягу ўсяго парэформеннага перыяду да гэтага часу не праводзілася.

Актуальнай праблемай, якую паспяхова даследуе С.А. Талмачова, з’яўляецца таксама выяўленне сукупнасці прычын і фактараў, якія выклікалі неабходнасць стварэння, а ў будучым – меры ўраду па рэарганізацыі і

рэфармаванню органаў мясцовага кіравання, удасканаленне іх дзейнасці. Пры гэтым адзначаны ўрадавыя мерапрыемства, праводзімыя з улікам эканамічных асаблівасцей для розных рэгіёнаў Беларусі. Прадстаўляецца заслугоўваючым увагі характарыстыка вертыкалі улады, якая не толькі кіравала, але і трымала пад кантролем працэсы, звязаныя з рэалізацыяй рэформы і, пры неабходнасці, мяняла тактыку з улікам тых задач і выклікаў, якія паўставалі перад ёю ў розных умовах жыцця грамадства. Несумненна, гэта з'яўляецца новым падыходам у айчыннай гістарыяграфіі.

Варта адзначыць, што ў Рэспубліцы Беларусь у навуковых даследаваннях усё большае значэнне набывае іх практыкаарыентаваны характар. Развіццю сельскай гаспадаркі краіны надаецца пастаянная ўвага, удасканальваюцца тэхналогіі і метады кіравання ёй. Па гэтай прычыне вывучэнне гістарычнага вопыту вырашэння аграрных праблем, у тым ліку звязаных з дзейнасцю мясцовых органаў кіравання сельскагаспадарчай вытворчасцю, з'яўляецца актуальным.

**Ступень навізны вынікаў, якія атрыманы ў дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону.**

Навуковы ўклад спашукальніка бачыцца ў фундаментальнай распрацоўцы і вырашэнні буйной навуковай праблемы, непасрэдна звязанай з карэннымі пераўтварэннямі ў сельскай гаспадарцы беларускіх губерніяў ва ўмовах пераходу Расіі ад традыцыйнага да індустрыяльнага грамадства, істотнымі зменамі, якія адбываліся ў эканоміцы і сацыяльнай сферы. Дысертацыя С.А.Талмачовай з'яўляецца першым у айчыннай гістарыяграфіі комплексным даследаваннем, у якім канцэптуальна раскрываецца важная ў навуковым, эканамічныі і сацыяльным плане праблема, звязаная з фарміраваннем, рэарганізацыяй, вызначэннем задач, функцый, ролі і практычнай дзейнасці мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага самадзяржаўя на тэрыторыі Беларусі ў 1861–1914 гг.

Палажэнні, выносімыя на абарону, высновы адпавядаюць мэце і задачам дысертацыі. У адпаведнасці з імі вызначана структура работы. Іх аналіз дазваляе сцвярджаць аб грунтоўных падыходах спашукальніка да правядзення дысертацыйнага даследавання і яго высокім навуковым ўзроўні.

Спашукальнік грунтоўна прааналізавала абшырны комплекс апублікаваных дакументаў і архіўных матэрыялаў: фонды Дэпартамента законаў (фонд 1149), Заходняга камітэта (фонд 1267), Савета міністра ўнутраных спраў (фонд 1281), Дэпартамента агульных спраў (фонд 1284), Земскага аддзела МУС (фонд 1291), Камісіі аб губернскіх і павятовых установах (фонд 1316), «Каханаўскай» камісіі (фонд 1317), Земскага аддзела МУС (фонд 1291), Галоўнай выкупной установы (фонд 577), Міністэрства юстыцыі (фонд 1405), асабістых фондаў дзяржаўных дзеячаў і інш. Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва, дакументы з Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва, Нацыянальных гістарычных архіваў Беларусі ў Мінску і Гродне. Іх пераважная большасць упершыню ўведзены ў навуковы ўжытак, пераасэнсавана на падставе новых крыніцазнаўчых метадаў.

С.А. Талмачова прааналізавала вялікі пласт гістарыяграфіі – расійскай дарэвалюцыйнай, савецкай, сучаснай беларускай і расійскай, украінскай, амерыканскай, выявіла канцэптуальныя падыходы і ступень распрацоўкі даследуемай праблемы. Фактaлагічны матэрыял, выяўлены ў архівах, верыфікаваны з дадзенымі з іншых крыніц, працамі айчынных і замежных аўтараў.

Усё гэта ў сукупнасці з прымяненнем метадалогіі і метадаў гістарычнага даследавання дазволіла сфармуляваць аўтарскую канцэпцыю доктарскай дысертацыі, аргументавана і лагічна вырашаць шырокі спектр задач, якія маюць важнае значэнне для разумення пастаўленай праблемы, зрабіць навукова абгрунтаваныя высновы.

Новым падыходам у беларускай гістарыяграфіі з'яўляецца прапанаваная і навукова абгрунтаваная спашукальнікам перыядызацыя дзяржаўнай аграрнай палітыкі. Папярэдняя, якая існавала ў савецкай гістарыяграфіі, была заснавана на марксісцка – ленінскай метадалогіі і вызначалася так званымі рэвалюцыйнымі сітуацыямі. У сучаснай айчыннай гістарычнай навуцы ўзнікла неабходнасць яе перагляду ў сувязі з пераасэнсаваннем аграрнай палітыкі расійскага ўрада ў 1861-1914 гг. Гэтую задачу з поспехам вырашыла С.А.Талмачова. Яна вылучыла два перыяды ў гэтай палітыцы — з лютага 1861 г. па лістапад 1906 г. і з лістапада 1906 г. да пачатку Першай сусветнай вайны ў 1914 г.

Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі спашукальнік ўсебакова даследавала структурныя элементы дзяржаўнага механізму па рэалізацыі аграрных рэформ 1861 г. і 1866 г.: міравых пасрэднікаў, павятовых з'ездаў міравых пасрэднікаў, губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей, паверачных камісій, паказала вынікі іх дзейнасці ў беларускай вёсцы.

У папярэдніх даследчыкаў не былі прадметам спецыяльнага вывучэння дзейнасць рэфармаваных губернскіх і створаных павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях, а таксама павятовых па чыншавых справах прысутнасцей на тэрыторыі Беларусі па заканадаўству 1874 г. і 1886 г. Новым падыходам, вызначаным С.А. Талмачовай, з'яўляецца ўстанаўленне і абгрунтаванне прычын маруднасці ажыццяўлення аграрных мерапрыемстваў, якая была абумоўлена калегіяльнасцю губернскіх і павятовых прысутнасцей, павелічэннем колькасці спраў па пазямельным уладкаванні, спецыфічных толькі для заходніх губерняў сацыяльных груп саслоўя сельскіх абывацелей, імкненнем супрацьпаставіць землеўласнікаў і чыншавую шляхту і інш.

У айчыннай гістарыяграфіі дзейнасць земскіх начальнікаў знайшла пэўнае адлюстраванне, аднак работа павятовых з'ездаў земскіх начальнікаў, іх узаемадзеянне з губернскімі прысутнасцямі да гэтага часу не даследаваліся. Да рэчы, і само функцыянаванне апошніх двух структурных элементаў сістэмы мясцовага дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада не знайшла адлюстравання ў айчыннай гістарычнай навуцы, што падкрэслівае навізну дысертацыйнага даследавання.

Новымі падыходамі адзначаюцца вызначэнне і характарыстыка накірункаў узаемадзеяння павятовых і губернскіх землеўладкавальных камісій, губернскіх прысутнасцей, земскіх начальнікаў і іх павятовых з'ездаў у ходзе рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы. На аснове крыніцазнаўчага аналізу і новых метадалагічных падыходаў С.А.Талмачова даказала, што зладжанае ўзаемадзеянне ўсіх названых элементаў сістэмы органаў мясцовага кіравання спрыяла больш паспяховаму правядзенню сталынінскай аграрнай рэформы на тэрыторыі Беларусі.

**Абгрунтаванасць і верагоднасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі.**

Дакладнасць, абгрунтаванасць і верагоднасць заключных вывадаў, сфармуляваных у дысертацыі, заснаваны на шматаспектным аналізе багатага факталагічнага матэрыялу: бібліяграфічны спіс складаецца з 875 найменняў выкарыстаных матэрыялаў і публікацый, у тым ліку матэрыялы з архіваў Беларусі, Расіі і Літвы, статыстычныя матэрыялы і інш. Аб'ектыўнасць высноў дасягалася апорай на інфармацыю рознапланавых крыніц, вынікі даследаванняў іншых аўтараў, спалучэннем верыфіцыраваннага эмпірычнага матэрыялу з прынцыпам каштоўнаснага падыходу.

Прадмет даследавання раскрыты на аснове сінтэзу разнастайных метадалагічных падыходаў, грунтуецца на мадэрнізацыйнай тэарэтычнай парадыгме. Яно праведзена зыходзячы з прынцыпаў гістарызму, аб'ектыўнасці і каштоўнаснага падыходу. Для аб'ектыўнага разумення сутнасці аграрнай палітыкі ўрада дзейнасць усіх структурных элементаў органаў мясцовага дзяржаўнага кіравання разгледжана праз прызму ўзаемадзеяння з іншымі працэсамі, якія працякалі ў сацыяльна-эканамічнай, палітычнай і культурнай сферах.

Практычным інструментарыем даследавання сталі як агульнанавуковыя (аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, аналогія, мадэліраванне і інш.), так і канкрэтна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны) і спецыяльна-юрыдычныя (фармальна-юрыдычны і параўнальна-прававы) метады. Прымяненне гісторыка-тыпалагічнага метаду дазволіла С.А.Талмачовай упершыню ў гістарычнай навуцы вылучыць і абгрунтаваць два этапы аграрнай палітыкі расійскага ўрада, даць перыядызацыю працэсу стварэння і дзейнасці спецыяльна створаных мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па яе рэалізацыі, устанавіць розначасовасць і рознапрасторавасць іх функцыянавання.

Даследаванне грунтуецца на мадэрнізацыйнай тэарэтычнай парадыгме, якая сфарміравалася ў другой палове XX ст. Гэта дазволіла спашукальніку паказаць шматвектарнасць, супярэчлівасць у развіцці грамадства, з элементамі рэгрэсіўных з'яў, што знайшло адлюстраванне ў арганізацыі і функцыянаванні мясцовых дзяржаўных органаў кіравання па сялянскіх справах і выніковасці аграрных пераўтварэнняў. У цэлым рэалізацыя прынцыпаў, выкарыстанне агульнанавуковых і канкрэтна-гістарычных метадаў, навуковых тлумачэнняў у сваёй сукупнасці дазволілі выявіць сутнасныя бакі дзейнасці мясцовых органаў

дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі ўрада ў Беларусі ў 1861–1914 гг. На аснове гэтага сфармулявана канцэпцыя даследавання.

**Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні.**

*Навуковая значнасць.* Дысертацыйная праца Талмачовай С.А. уяўляе сабой навуковую значнасць і адкрывае новы напрамак у даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі перыяду капіталізма. Вызначаны і магчымыя кірункі новых даследаванняў у вывучэнні дзяржаўнай аграрнай палітыкі, узаемадзеянні цэнтральных і мясцовых уладных структур.

Вырашэнне дадзенай праблемы звязана з далейшай распрацоўкай пытанняў стварэння і дзейнасці структур па рэалізацыі аграрнай палітыкі на рэгіянальным узроўні, з улікам эканамічных, сацыяльных, прыродных, гістарычных і інш. асаблівасцей рэгіёна. Яно надае не толькі прынцыпова новы ракурс вывучэнню сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі, але і ўносіць важкі ўклад у распрацоўку канцэпцыі гісторыі беларускай дзяржаўнасці.

*Практычная значнасць.* Заключаецца ў стварэнні навуковай базы (прынцыпаў і інструментарыяў) для далейшай распрацоўкі праблем аграрнай палітыкі расійскага самадзяржаўя на беларускіх землях ва ўмовах мадэрнізацыйных пераўтварэнняў. Вынікі даследавання знойдуць прымяненне пры напісанні абагульняючых прац па гісторыі Беларусі і Расіі, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Тэарэтычныя палажэнні і факталагічны матэрыял будуць карыснымі пры падрыхтоўцы спецкурсаў і правядзенні спецсемінараў, напісанні курсавых і дыпломных работ, а таксама магістарскіх, кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Гістарычны вопыт рэалізацыі аграрнай палітыкі на тэрыторыі Беларусі можа быць пераасэнсаваны і творча выкарыстаны у сучасных умовах органамі мясцовай улады, непасрэдна звязаных з сельскагаспадарчай вытворчасцю.

*Сацыяльная значнасць.* Спецыфіка гісторыі як навукі заключаецца ў тым, што яна выконвае не толькі навукова-пазнавальную, выхаваўчую, але і функцыю сацыяльную. Механізм фарміравання і дзейнасці рэгіянальных структур па рэалізацыі аграрнай палітыкі, іх кадравае забеспячэнне, нарматыўна-прававая база, пастаянная ўвага да іх з боку вышэйшых дзяржаўных органаў у многім спрыяла не толькі вырашэнню задач сельскагаспадарчай вытворчасці, але і звязаных з ёю сацыяльных праблем беларускага сялянства. З улікам гэтага прадстаўляецца годным увагі выкарыстанне дадзеных аспектаў у дзейнасці кіруючых органаў Рэспублікі Беларусь.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку.** Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі прадстаўлены ў 84 публікацыях, з якіх 1 манаграфія (20,0 аўт. л.), 14 – раздзелы ў калектыўных навуковых выданнях, падрыхтаваных у сааўтарстве (19,4 аўт. л.), 21 – у выданнях, уключаных ВАК Рэспублікі Беларусь у пералік навуковых выданняў для апублікаваннія вынікаў дысертацыйных даследаванняў (15,9 аўт. л.), у тым ліку 2 – у замежных выданнях, уключаных у рэфератыўную базу данных Scopus і Web of Science (2,1 аўт. л.), 12 – у рэцэнзаваных зборніках навуковых артыкулаў (6,7 аўт. л.), у

тым ліку 2 – у замежных выданнях, 36 – у зборніках матэрыялаў міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцый (16,8 аўт. л.). Агульны аб'ём апублікаваных работ складае 78,8 аўт. л.

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК.** Дысертацыя аформлена ў адпаведнасці з інструкцыяй Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 28.02.2014 г. Прысутнічаюць усе неабходныя структурныя элементы. Парушэнняў у афармленні табліц і дадаткаў не выяўлена. У дысертацыі ёсць усе неабходныя спасылкі на аўтараў і крыніцы, якія былі выкарыстаны саіскальнікам, а таксама на ўласныя публікацыі, у якіх прадстаўлены асноўныя вынікі дысертацыйнага даследавання.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Узровень падрыхтоўкі дысертацыйнага даследавання, аб'ём і якасць факталагічнага матэрыялу, яго інтэрпрэтацыя, навізна і абгрунтаванасць высноў, а таксама апублікаванасць вынікаў работы, актыўны ўдзел аўтара ў навукова-даследчых тэмах і канферэнцыях сведчаць пра высокую навуковую кваліфікацыю Талмачовай С.А. і адпаведнасць яе вучонай ступені доктара гістарычных навук.

**Недахопы дысертацыі.** Змест дысертацыі пераконвае ў належнай кваліфікацыі аўтара. Разам з тым, пры азнаямленні з дысертацыяй узніклі заўвагі і пытанні, якія патрабуюць дадатковага каментарыя саіскальніка:

– у аглядзе расійскай дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі спашукальнік адзначыла, што ў многіх публікацыях крытычна і нават негатыўна ацэньвалася дзейнасць мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі, злоўжыванні і бяздзейнасць чыноўнікаў. Разам з тым, спашукальнік не выказала сваёй ацэнкі наконт аб'ектыўнасці і распаўсюджанасці прыведзеных у публікацыях падобных фактаў;
– у савецкай гістарыяграфіі органы, якія займаліся рэалізацыяй рэформы, адназначна ацэньваліся як рэакцыйныя, а іх дзейнасць як прадваранская. У якой ступені гэта адпавядала рэчаіснасці?
– пасля паўстання 1863 – 1864 гг. царскі ўрад замяніў у шэрагу структур, якія ажыцяўлялі аграрную рэформу, дваран-католікаў на чыноўнікаў, прысланых з расійскіх губерняў. У дысертацыі недастаткова глыбока паказана, як змянілася дзейнасць гэтых органаў у сувязі з такімі кадравымі перастаноўкамі, наколькі эфектыўна сталі вырашацца зямельныя праблемы і ў якой ступені гэта задавальняла сялянства;
– у дысертацыі не адзначаецца, якую адказнасць неслі чыноўнікі за злоўжыванні службовым становішчам, карупцыю, іншыя парушэнні. Якія меры прымаліся на заканадаўчым узроўні для прадухілення такіх з'яў і наколькі шырока яны былі распаўсюджаны?
– са зместу дысертацыі відаць, што ўвесь парэформенны перыяд часта мянялася нарматыўна-прававая база, што прыводзіла, у сваю чаргу, да рэарганізацыі існуючых мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі і з'яўленні новых. Спашукальніку варта было б даць гэтаму ацэнку, паказаць, наколькі эфектыўнымі былі такія

рэарганізацыі, як яны паўплывалі на паспяховае вырашэнне сялянскага пытання і ў цэлым на рэалізацыю аграрнай палітыкі.

Аднак выказаныя заўвагі не зніжаюць навуковую вартасць і практычную значымасць праведзенага даследавання.

**Заключэнне.**

Усё вышэйазначанае дае падставу сцвярджаць, што дысертацыя Талмачовай С. А. "Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі (1861–1914 гг.)", прадстаўленая на саісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя, з'яўляецца самастойна выкананым кваліфікаваным даследаваннем па актуальнай тэму, у якім утрымліваюцца новыя, навукова абгрунтаваныя вынікі, якія маюць тэарэтычнае і практычнае значэнне.

У адпаведнасці з Палажэннем аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў ў Рэспубліцы Беларусь Талмачова Святлана Аляксандраўна заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя за:

– фундаментальную распрацоўку праблемы мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада ў беларускіх губернях як важнейшага напрамаку мадэрнізацыі гаспадарчых адносін у сельскай гаспадарцы ў 1861–1914 гг.; паказ дынамікі іх развіцця, прычын і праблем рэарганізацыі; вызначэнне перыядаў ў гэтай палітыцы — з лютага 1861 г. па лістапад 1906 г. і з лістапада 1906 г. да пачатку Першай сусветнай вайны ў 1914 г. і аргументаваную іх характарыстыку;

– вызначэнне і грунтоўнае даследаванне структуры мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрных рэформ 1861 г. і 1866 г. (міравыя пасрэднікі, павятовыя з'езды міравых пасрэднікаў, губернскія па сялянскіх справах прысутнасці, паверачныя камісіі) і вынікаў іх дзейнасці (зацвярджэнне ўстаўных грамат, выкупных і люстрацыйных актаў з пераводам памешчыцкіх і дзяржаўных сялян на абавязковы выкуп з паніжэннем выкупных плацяжоў і, у большасці выпадкаў, павелічэннем зямельных надзелаў);

– раскрыццё структуры, функцыянальных абавязкаў і вынікаў работы рэфармаваных паводле закону 1874 г. мясцовых органаў кіравання (губернскія і павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях) і створаных па закону 1886 г. павятовых па чыншавых справах прысутнасцей з выяўленнем асаблівасцей фарміравання кадравага складу органаў мясцовага кіравання, ступені эфектыўнасці і высвятленнем прычын замаруджвання ў ажыццяўленні аграрных пераўтварэнняў, адной з якіх была калегіяльнасць губернскіх і павятовых прысутнасцей і адначасовым павелічэннем колькасці спраў па пазямельным уладкаванні ўласцівых толькі для заходніх губерняў сацыяльных груп саслоўя сельскіх абывацелей;

– вызначэнне спецыфікі дзейнасці інстытута земскіх начальнікаў і іх павятовых з'ездаў, асаблівасцей фарміравання яго кадравага складу, выніковасці работы на тэрыторыі Беларусі і доказ таго, што ўвядзенне інстытута земскіх нальнікаў як правобраза міравых пасрэднікаў 1861–1863 гг. не адпавядала рэаліям часу;

– выяўленне механізму ўзаемадзеяння павятовых і губернскі землеўладкавальных камісій з земскімі начальнікамі і іх павятовымі з’ездам губернскімі прысутнасцямі ў працэсе ажыццяўлення сталыпінскай аграрна рэформы з абгрунтаваннем яго выніковасці на тэрыторыі Беларусі.

Афіцыйны апанент,
доктар гістарычных навук, прафесар,
прафесар кафедры гісторыі Беларусі,
археалогіі і спецыяльных гістарычных
дысцыплін установы адукацыі
«Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Янкі Купалы» Э.С.Ярмусік

ПОДПИСЬ УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник отдела управления персоналом
учреждения образования «Гродненский
государственный университет имени Янки Купалы»
С.В. Нестерович
05. 05. 2023 г.